ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO. 22 (3478) ● ● ЧАЦВЕР, 16 ЧЭРВЕНЯ, 2016

ШТОТЫДНЁВІК "ГОЛАС РАДЗІМЫ" МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: WWW.GOLAS.BY




**Вянок яго лёсу**

125-я ўгодкі Максіма Багдановіча сёлета адзначаюць і ў Расіі Стар. 2



**Ёсць выдатны прэс-кантакт!**

Беларускія выданні былі прадстаўлены на фестывалі "Пресса-2016" у Самары Стар. 3



**Прыгажосць адчулі сэрцам**

Цюменьскі беларусы расказалі чытачам абласной бібліятэкі пра "Зямлю з блакітнымі вачамі" Стар. 4

СВЯТА

## Сустракаемся ў Гродне

### На розных мовах віталі жыхароў і гасцей горада над Нёманам удзельнікі XI Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур

**Кацярына Мядзведская**

Старажытны горад Гродна зноў сустракаў Фестываль, што за 20 год стаў для яго брэндавым, сімвалічным. "Дзень добры!.. Шалом!.. Буэнас дзіас!.. Гамарджоба!.." — чулася з усіх бакоў.

Традыцыйна свята распачалося шэсцем прадстаўнікоў розных дыяспар: азербайджанцы, афганцы, казахі, рускія, украінцы, яўрэі... Некаторыя нацыянальнасці былі прадстаўлены сёлета ўпершыню. Так, хлопчык-саксафаніст Максім Сарока з Рагачова, бацька якога амерыканец, прадстаўляў ЗША. Браты Махер і Дзія Салом Алшых, студэнты Белдзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў, — Сірыю. А студэнт Гродзенскага медуніверсітэта Місбахул Рахумана Акіб — Шры-Ланку. Дружная кампанія хлопцаў і дзяўчат расказвала танцамі пра родную ім Нігерыю — гэта навучэнцы розных беларускіх ВНУ: сяброўкі Дзімаку Іфуная і Малокву Даян, апранутыя ў разнакаляровыя доўгія сукенкі, са сплеценымі ў высокія прычоскі валасамі, падрыхтавалі традыцыйны танец свайго народа. На падворку ж разам з дзяўчатамі, бачыла, танчыў іх сябра Агу Учэчукву Саксэс. Упершыню прыехалі на фестываль чачэнцы і ліванцы. Усяго ж у свяце ўдзельнічалі прадстаўнікі 38 нацыянальнасцяў.

На цэнтральных вуліцах Гродна — і танцы, і спевы, і тэатралізаваныя прадстаўленні ад кожнай дэлегацыі. Ад гаспадароў жа ўдзельнікі атрымалі святочныя караваі ў выглядзе сонейка з устаўленымі ўнутр саламянымі салонкамі: па старадаўняй славянскай традыцыі гасцей прынята частаваць самым дарагім, самым лепшым. Вось і ў Гродне сустракалі хлебам ды соллю.



КАЦЯРЫНА МЯДЗВЕДСКАЯ

**Вясёлая фестывальная плынь святочна віруе па гродзенскіх вуліцах**

Шумна, весела, цікава было і на традыцыйных нацыянальных падворках. Ліліся гукі музыкі, радавалі вочы яркія колеры строяў артыстаў творчых этнакалектываў. У літоўскім дворыку, напрыклад, можна было адведаць цэпелінаў, халоднага баршчу, выпечку. Там жа — драўляныя млын і хата. Старшыня суполкі "Віціс" Альфрыдас Кершыс казаў: звычайна ў жыллё літоўскіх сем'яў было прынята ставіць дабротную мэблю, упрыгожваць яе разьбою, сурвэткамі.

Дарэчы, пазнаёміць гасцей фестывалю з традыцыямі дома, інтэр'ера розных народаў было адной з задумак арганізатараў. Таму казахі збудавалі юрты, прадстаўнікі каўказкіх народаў — саклі. Хоць і не ў сапраўдную мазанку, аднак у стылізаваны падворак з абразом і ручнікамі запрашалі ўкраінцы, частуючы гасцей баршчом з пампушкамі. Рускія ўпрыгожылі свой этнакуточак тульскім самаварам ды коўдрамі. Венесуэльскі дворык быў, пэўна, самы прыбраны: шмат было кветак ды гірляндаў. Кіраўнік Лацінаамерыканскага культурнага цэнтра імя Сімона Балівара Эстрада Херарда казаў, што венесуэльцы — нежурботны народ, сумаваць ім няма калі. І тады ж музыкі зайгралі вясёлую мелодыю. → Стар. 4

ВЕСТКІ

## Будучыню ствараем разам

**Кацярына Аляксандрава**

**На V Усебеларускі народны сход, які пройдзе ў Мінску 22-23 чэрвеня, у якасці ганаровых гасцей запрошаны і прадстаўнікі беларускіх суполак замежжа**

У спісе гасцей-беларусаў замежжа, што даслалі ў рэдакцыю з МЗС Беларусі, — каля трыццаці асобаў. Самая вялікая дэлегацыя чакаецца, па традыцыі, з Расіі. Федэральную нацыянальна-культурную аўтаномію "Беларусы Расіі" прадставяць яе старшыня Сяргей Кандыбовіч і намеснік Валерый Казакоў. З Томска прыедзе старшыня рэгіянальнай арганізацыі беларусаў Любоў Адаскевіч, з Югры — Сяргей Бандарэнка, з Цюмені — Ганаровы генеральны консул Беларусі Уладзімір Шугля. З Калінінградскага зямляцтва будзе Святлана Зязера, а з Масквы — Аксана Солапава. У V Усебеларускім народным сходзе прымуць удзел і знакамітыя ўраджэнцы Беларусі — касманаўты Пётр Клімук і Уладзімір Кавалёнак, намеснік старшыні Камітэта Савета Федэрацыі Федэральнага сходу РФ па абароне і бяспецы Франц Клінцэвіч.

Дарэчы, нядаўна пад час адкрыцця павільёна "Космас" у Мінскім аэраклубе Уладзімір Кавалёнак адзначыў: "На Усебеларускім народным сходзе будзем узнімаць пытанне, каб Беларусь прымала ўдзел у падрыхтоўцы сваіх касманаўтаў".

На сходзе будуць і суплеменнікі з Арменіі, ЗША, Ізраіля, Казахстана, Малдовы, Украіны, Швейцарыі, Вялікага Герцагства Люксембург. Чакаюцца ўдзельнікі з Прыбалтыйскіх краін: Літвы, Латвіі, Эстоніі, Польшчы.

СЦЕЖКАМІ ПАМЯЦІ

## Халодныя сляды гарачых бітваў

**Да 75-х угодкаў пачатку Вялікай Айчыннай вайны пабачыла свет кніга Вадзіма Шораха "Эвалюцыя ўмацаванняў Заходняй Беларусі"**

Спадчына з мінулага бывае рознаю. І вось ужо навукоўцы даследуюць адметныя фартыфікацыйныя збудаванні, што засталіся з мінулых часоў на тэрыторыі Беларусі. Асабліва шмат розных аб'ектаў у нас — з XIX-XX стагоддзяў. Між тым раней іх ніхто сістэмна, па сутнасці, не вывучаў. У кнізе, якая нядаўна выйшла, упершыню зроблена такая спроба: сістэмна рэканструяваць час, абставіны, у якіх ствараліся, напрыклад, фарты Брэсцкай крэпасці, а таксама дзоты, бліндажы, агнявыя кропкі. Іх можна пабачыць пад Баранавічамі, Дзяржынскам, у іншых месцах краіны. Мне ж кніга Вадзіма Шораха бачыцца вартай увагі шырокіх колаў чытачоў, гэткім узорам арганічнага спалучэння ваеннага, інжынернага, гістарычнага мыслення. Да месца будзе расказаць пра яе напярэдадні 75-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Не сакрэт: у любой справе многае вырашаюць энтузіясты. З іх ліку і члены даследчай групы брэсцкіх навукоўцаў "Крапіва" Вадзім Шорах і Віталь Барысаў. Яны даследуюць фартыфікацыйныя збудаванні, прычым генератар ідэй, кіраўнік Вадзім Сяргеевіч Шорах яшчэ і година выклаў вынікі ў чарговай кнізе. Размова пра гісторыю атрымалася сістэмнаю, глыбокаю, цікаваю. Што, як, калі, кім і чаму ўзводзілася ў заходнебеларускім рэгіёне ў XIX-XX стагоддзі? Пададзена ж храналогія даўніх падзей у жорсткай прывязцы да канкрэтных людзей, якія мелі ўладныя паўнамоцтвы ў рэгіёне ды імі й карысталіся. А такіх суб'ектаў, як кажуць навукоўцы, можна налічыць пяць. Да Першай сусветнай вайны, як вядома, рэй тут вялі ўлады Расійскай імперыі: бо тэрыторыі былі ў яе складзе. А з кастрычніка 1915 да 18 лютага 1918 года быў тут іншы "гаспадар": падданыя германскага кайзера Вільгельма II цалкам кантралявалі прастору на захад ад лініі Дзвінск-Паставы-Баранавічы-Пінск. Дарэчы, заходнебеларускія жыхары тую ўладу называюць: "першыя немцы". Затым тэрыторыя пашырылася і ў такім выглядзе праіснавала да восені 1918-га. Далей была ўлада 2-й Рэчы Паспалітай: большую частку савецка-польскай вайны, а таксама ў 1921-39 гадах Заходняя Беларусь была, можна сказаць, у кіпцюрах "белага арла". У 1939-м яна ўвайшла ў склад СССР: да заходнебеларускіх жыхароў прыйшлі "першыя Саветы". Ненадоўга, бо ў 1941-44 гады былі "другія немцы": гэта трагічны для рэгіёну перыяд германскай акупацыі. Улады параўнальна хутка змяняліся — і кожны з згаданых "суб'ектаў" узводзіў нейкія фартыфікацыйныя збудаванні.




**Вокладка новай кнігі**

→ Стар. 3


Удзельнікі літаратурна-музычнага салона "Вечар у Багдановіча" і сябры музея з творчых суполак горада

# Вянок яго лёсу

## 125-я ўгодкі Максіма Багдановіча сёлета адзначаюць і ў Расіі

Да юбілею класіка беларускай літаратуры, значная частка жыцця якога праходзіла ў Паволжы, рыхтуецца шэраг імпрэзаў у Яраслаўлі. Як вядома, у нашым горадзе Максім Багдановіч жыў найдаўжэй: з 1908-га да ад'езду ў Мінск восенню 1916-га. У 1911-м, закончыўшы гімназію, паступіў у Яраслаўскі юрыдычны ліцэй. Па сутнасці, у яраслаўскі перыяд раскрываўся ягоны паэтычны, пісьменніцкі талент. І гістарычна цалкам апраўдана, што нядаўна ў Яраслаўскім мемарыяльным музеі Максіма Багдановіча ладзіўся літаратурна-музычны салон "Вечар у Багдановіча" — у плыні міжнароднай акцыі "Ноч музеяў".



У Дзень Яраслаўля супрацоўнікі музея выйшлі "ў народ"



Музей наш — гэта драўляны дом у цэнтры Яраслаўля. Госці, наведаўшы яго, акунуліся ў атмасферу музычна-літаратурнага салона мінулых часоў, пазнаёміліся з гаспадаром салона Максімам Багдановічам і ягонай музай — гэта была Ганна Какуева, яго першае каханне (на здымку побач). Паэт прысвяціў ёй нямала вершаў. Ганна была піяністкай, роднаю сястрой Рафаіла Какуева, гімназічнага сябра Максіма. Вучылася ў кансерваторыі ў Санкт-Пецярбурзе, прыязджала ў Яраслаўль, дзе жылі Багдановічы, на лета. Лічыцца, што знакаміты верш "Зорка Венера" Максім прысвяціў Ганне. Пэўна, радкі "Але расстацца нам час наступае:/ Пэўна, ўжо доля такая у нас..." — гэта якраз пра тыя сустрэчы. Аднак пачуцці паэта Ганна не падзяліла, у маі 1914-га выйшла замуж за яго гімназічнага сябра Івана Лілеева (1892—1966).

У інтэрнэце знаходзім: іхні сын Мікалай Лілееў (1921—31.08.2011) жыў і вучыўся ў Ленінградзе, быў на фронце, трапіў у палон, прайшоў праз лагеры — як фашысцкія, так і савецкія… Напісаў мемуары "Не повезет — не выживешь": ёсць у нэце. Сябраваў з мінскім Літмузеем Максіма Багдановіча, падарыў туды нямала рэчаў маці. Ганна Рафаілаўна (1890—1961) зберагала адзіны прыжыццёвы зборнік вершаў паэта "Вянок", які Максім падпісаў, праўда, сябру, брату Ганны Мікалаю Какуеву. А Ганне паэт хацеў прысвяціць зборнік "Палын-трава" — бо гэта паэтычны аповед пра ягонае горкае, неўзаемнае пачуццё…

На "Вечарах ў Багдановіча" гучалі рамансы ў выкананні капэлы Яраслаўскага дзяржуніверсітэта імя П. Р. Дзямідава, вершы сучаснікаў Багдановіча — паэтаў Сярэбранага веку. Танцы з мінулай эпохі выконвалі ўдзельнікі Клуба старадаўняга танца і ролевага ўзаемадзеяння "Зазеркалье", можна было і пагуляць у традыцыйныя салонныя гульні. Займальную пастаноўку паказаў Клуб ролевага, гістарычнага і арт-фехтавання "Альянс". У аснове дзеі была "Скандынаўская песня" Лявона Вольскага, напісаная ім на аднайменны верш класіка.

І яшчэ адна падзея — таксама са згадкаю пра Багдановіча. 28 мая, у Дзень горада Яраслаўля, наш музей прыняў удзел у рабоце творчай пляцоўкі АртБульвар. Жыхары і госці горада мелі магчымасць наведаць музей бясплатна, даведацца пра жыццё і творчасць беларускага паэта з берагоў Волгі. Ахвочых мы навучалі, як вырабіць сувеніры ў тэхніках беларускай выцінанкі ды роспісу па дрэве.

На заканчэнне дадам: два гэтыя мерапрыемствы толькі распачалі насычаны юбілейны "Год Максіма Багдановіча" ў Яраслаўлі. Будуць іншыя падзеі — на працягу ўсяго года.

**Марына Калкоціна,**
навуковы супрацоўнік
Яраслаўскага мемарыяльнага
музея Максіма Багдановіча

**ВЕСТКІ**

## У цэнтры ўвагі — рэгіёны

**Прадстаўнікі больш чым сарака рэгіёнаў Расіі пабывалі на Форуме ў Мінску**

Развіццё ўзаемавыгадных кантактаў на ўзроўні рэгіёнаў — эфектыўная форма беларуска-расійскага супрацоўніцтва. На мінскім, ужо трэцім Форуме рэгіёнаў Беларусі ды Расіі працавала 9 секцый. Форумы, так павялося, — гэта і месца, дзе ўсталёўваюцца прамыя кантакты між рэгіёнамі, прадпрыемствамі, арганізацыямі Беларусі ды Расіі. На гэты раз асноўная ўвага надавалася супрацоўніцтву ў сацыяльна-эканамічнай, навукова-адукацыйнай, культурна-гуманітарнай ды іншых сферах.

Цэнтральнай падзеяй Форуму стала пленарнае пасяджэнне на тэму "Рэалізацыя ўзгодненай сацыяльна-эканамічнай палітыкі ў Саюзнай дзяржаве: дасягненні, праблемы, шляхі вырашэння і перспектывы". Яно прайшло пад старшынствам Міхаіла Мясніковіча і Валянціны Матвіенкі, з удзелам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ды Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна. Пад час мінскага Форуму быў падпісаны шэраг кантрактаў па пастаўках у Расію беларускай тэхнікі, нафтапрадуктаў. Падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Магілёўскай і Тульскай абласцямі ў гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай і культурнай галінах.

Да Форуму выйшаў спецвыпуск часопіса "Беларусь. Belarus" (выданне ўваходзіць у холдынг "Редакция газеты "Советская Белоруссия", ёсць на адпаведным партале ў інтэрнэце). Сярод іншых там — артыкул "Зямля і неба Уладзіміра Шуглі": пра Ганаровага генеральнага консула Беларусі ў Сібіры, які быў сярод удзельнікаў Форуму. А ў тэксце "Прыгажосць народнай дыпламатыі" гаворка — пра беларусаў Прыбайкалля, іх прапанову да ўлад Іркуцка: наладзіць пабрацімскія сувязі з гарадамі Беларусі.

**ПРАЕКТЫ**

# Пад адкрытым небам Бацькаўшчыны

**Іна Ганчаровіч**

**Дзякуючы шэрагу вялікіх фатаграфій, што ўпрыгожылі агароджу Парку Чалюскінцаў у Мінску, можна ўбачыць цікавыя старонкі з архітэктурнай гісторыі Беларусі**

Больш за 100 фотаздымкаў архітэктурных каштоўнасцяў Беларусі ўпрыгожылі агароджу парка на праспекце Незалежнасці. Гэта Арт-цэнтр Вольгі ды Андрэя Смалякоў прапанаваў жыхарам і гасцям сталіцы такім чынам зазірнуць у вокны гісторыі Бацькаўшчыны. Калі ж я разглядвала выставу пад адкрытым небам, са здымкамі ў чалавечы рост, то падумала: пэўна, парадаваўся б таварыш Ленін, які ў свой час заклікаў несці "Искусство — в массы!" Выстава — гэта праект "Спадчына Беларусі. Аднаўленыя архітэктурныя каштоўнасці". Прыгожыя здымкі можна сузіраць у адным з любімых месцаў адпачынку мінчан. Прычым бясплатна. І ні табе музейных сцен, ні білетных кас — толькі тваё жаданне дакрануцца да прыгажосці, толькі сонца, толькі неба і пах кветак. А на прэзентацыі праекта яшчэ і дзясяткі юных мастакоў "ажыўлялі" фатаграфіі сваім мастацтвам. Проста эстэтычна-экалагічная ідылія…

У такой абстаноўцы арганізатары праекта Вольга і Андрэй Смалякі прапанавалі аматарам прыгажосці дакрануцца да тысячагадовай гісторыі краю, да самых прыгожых мясцінаў Беларусі. Асноўная ідэя арт-праекта — паказаць Беларусь краінай, якая мае даўнюю гісторыю. У беларусаў — шматвяковая культура і традыцыі, каштоўныя помнікі архітэктуры. І хай нехта паспрабуе цяпер хлусіць, быццам пачыналі мы з лапцяў пасля 1917 года… "Цяперашняя выстава паказвае ўнікальнасць і багацце беларускай гісторыі, культуры, — гаварыла актрыса, мастачка, арганізатар праекта Вольга Смаляк. — Гэтыя замкі, палацава-паркавыя комплексы, сядзібы, праваслаўныя і каталіцкія храмы, гарадскія ратушы, раскошныя аднаўленыя інтэр'еры — сведкі былога росквіту, сведкі нашай сённяшняй моцы і прыгажосці. Бо "Спадчына Беларусі. Аднаўленыя архітэктурныя каштоўнасці" — гэта не толькі адукацыйны праект альбо ўпрыгажэнне сталіцы. Гэта праект, які паказвае нашу высокую культуру, духоўнасць, адлюстроўвае пераемнасць традыцый, повязь пакаленняў".


Юная мастачка на мінскім пленэры

Аўтары здымкаў, на якіх адлюстравана адроджаная архітэктурна-гістарычная спадчына Беларусі — вядомыя журналісты і фатографы, лаўрэаты прэміі "За духоўнае адраджэнне" Алег Лукашэвіч і Аляксандр Аляксееў. Па іх словах, яшчэ 15 гадоў таму ў іх нарадзілася ідэя: паказаць на фота багатую, разнастайную архітэктурную спадчыну Беларусі. Яны шмат ездзілі па краіне, працавалі з навуковай літаратурай, з мастацтвазнаўцамі ды музейшчыкамі. Праект аказаўся запатрабаваным! Першы альбом "Спадчына Беларусі" (2004) быў раскуплены за месяц. "Асэнсоўваючы пройдзены шлях, мы з гонарам усведамляем: шмат зроблена дзяржавай па адраджэнні, аднаўленні архітэктурнай спадчыны, — сказаў пад час адкрыцця выставы Алег Лукашэвіч. — І гэта вельмі цэняць беларусы". Пры тым Вольга Смаляк дадала, што гэта ўжо чацвёрты праект Арт-цэнтра: "Прыемна, што яго палюбілі ў Мінску. Жыхары і госці сталіцы, вывучаючы прадстаўленыя славутасці, вызначаюць месцы сваіх будучых падарожжаў. Я бачыла шматкроць, як тут спыняюцца турыстычныя аўтобусы. Іх пасажыры маюць унікальную магчымасць у адным месцы пабачыць многія мясціны Беларусі. Турысты, бачачы ўсё разам, дзівяцца: маўляў, і не ведалі, што ў нас ёсць такое, і ўсяго так шмат. А значыць, нам ёсць чым ганарыцца!"

У дзень адкрыцця выставы прайшоў вялікі пленэр. Больш за 50 юных мастакоў з Гімназіі-каледжа мастацтваў імя Івана Ахрэмчыка выйшлі на вольнае паветра, каб "ажывіць" убачаныя фатаграфіі ды перадаць уражанні на сваіх палотнах. Прафесійнае журы абярэ тры лепшыя карціны, і яны таксама будуць размешчаны побач — на банеры. І разам з фотаздымкамі яшчэ цэлы год будуць упрыгожваць агароджу парку.

Завяршылася адкрыццё выставы флэшмобам "Звонавы перазвон": галасы званоў апавясцілі народ пра адкрыццё вялікай выставы пад адкрытым небам.

СЦЕЖКАМІ ПАМЯЦІ

# Халодныя сляды гарачых бітваў


Вадзім Шорах і Віталь Барысаў

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Свае даследаванні група "Крапіва" праводзіць, як піша аўтар, збіраючы асноўную інфармацыю ў полі. Потым ідзе супастаўленне яе з дакументальнымі дадзенымі. Дарэчы, нярэдка "на паперы" зафіксавана не тое, што ёсць на мясцовасці. Даследчыкі звычайна імкнуцца адпрэчыць свае эмоцыі, "не ваяваць" з мінулым, быць аб'ектыўнымі, аналізуючы яго сляды.


Ёсць свая суровая эстэтыка ў былых ваенных збудаваннях

Вадзім Шорах, асвятляючы пакручастыя сюжэтныя лініі айчыннай гісторыі, праяўляе сябе як сістэмны аналітык. Таму асноўныя этапы ўзвядзення заходнебеларускіх умацаванняў падаюцца ў прывязцы да такіх важных складнікаў ваенна-фартыфікацыйнай палітыкі, як тэхналагічны базіс ваенных арсеналаў дзяржавы, спецыфіка яе ваеннай дактрыны. Бярэцца да ўвагі стратэгія і тактыка абарончых дзеянняў. Дарэчы, шматлікія факты, што ўтвараюць, можна сказаць, станавы хрыбет для аналізу ўсіх этапаў фартыфікацыйных работ, сістэматызаваны ў кнізе. Напрыклад, былі ўмацаванні доўгачасовыя і палявыя, і вельмі цікава прааналізаваны іх характэрныя рысы. Аўтар прыходзіць да высновы, што мэта ўмацавання — не толькі вытрымаць трапленне (кулю ці снарадам, бомбаю), але і адбіць штурм праціўніка, што бывае значна складаней. З тых разваг становіцца зразумелым, чаму ў першай палове XIX стагоддзя ваенныя стратэгі ўскладалі вялікія надзеі "на буйныя крэпасці з шматлікім гарнізонам, якія мелі шмат гармат і ўсё неабходнае для доўгага сядзення ў аблозе".

Вучоны аналізуе, як рэфармавалася Брэсцкая крэпасць. Пабудаваная ў 1842-м, яна магла эфектыўна супрацьстаяць зброі, якой валодаў тагачасны праціўнік. Аднак прыйшла наразная артылерыя — і павялічылася дальнабойнасць, сіла агню. А зрабіць крэпасць такога памеру, каб яе цэнтр быў недасягальны для варожага абстрэлу — ці ж магчыма? Вучоны нагадвае пра ўрокі, якія далі Расіі праціўнікі ў Крымскай вайне 1853-56 гадоў. Воіны Англіі ды Францыі мелі наразныя штуцэры, і тое значна паўплывала на ход вайны: Расія пацярпела паразу. Не дапамог нават масавы гераізм пры абароне Севастопаля. Засвоіўшы той урок, творцы расійскай абарончай палітыкі ўзялі курс на ўзвядзенне абводаў з фартоў. Вось і аўтар прасачыў, як Брэсцкая крэпасць стала фартоваю. Хоць абводы з фартоў "моцна саступалі цытадэлі ў памерах і прастрэльваліся наскрозь, затое, у адрозненне ад суцэльных валаў і равоў, атачалі вялікую тэрыторыю, у цэнтр якой снарады не заляталі".

У кнізе ёсць цікавыя развагі аб прызначэнні фартоў. Аўтар мяркуе: спачатку яны захоўвалі функцыі артумацаванняў, нагадваючы ўзмоцненыя батарэі, але паступова фарты сталі пяхотнымі ўмацаваннямі. Артылерыю выносілі на асобныя пазіцыі, лепш замаскіраваныя і больш зручныя для вядзення агню. Аўтар робіць выснову: "Памер і колькасць гарнізонных збудаванняў ужо не граюць вызначальнай ролі, важнага разумнага прымянення на мясцовасці ды ўзаемадзеяння ўсіх частак абарончага комплексу". Ну а пасля Першай сусветнай вайны, прадаўжае Вадзім Шорах, "крэпасці адмерлі як такія, саступіўшы месца ўмацаваным раёнам. Стаўка рабілася на незаўважнасць аб'ектаў ды іх цяжкадаступнасць. Пры тым узбраенне стараліся не аслабляць, а сцены рабіць як мага больш трывала".

Далей аўтар паказвае, што і "палявая фартыфікацыя развівалася ў тым жа ключы. Розніца была ў тым, што палявыя збудаванні не разлічваліся на прамое трапленне снарадаў. А калі патрабуецца абарона толькі ад куль і аскепкаў, то няма розніцы, якой таўшчыні бетонная сцяна: 50 або 150 см". Як жа рабілі ўмацаванні ў вермахце і Рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі (РСЧА)? Пад час Другой сусветнай вайны па-рознаму: "Немцы ўмацоўвалі свае пазіцыі невялікімі бетоннымі будынкамі, савецкая армія аддавала перавагу дзотам і бліндажам. А паколькі на тэрыторыі Заходняй Беларусі фронт пад час 2-й Сусветнай вайны не стаяў доўга на адным месцы, то працяглых палос абароны, падобных да створаных у 1-ю Сусветную, ніхто не пабудаваў, хоць разрозненых захавалася нямала".

Кніга выйшла з друку напярэдадні 75-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны. І такім чынам вучоны нібы кажа важкае слова ў дыскусіі на прадмет няўдач РСЧА ў пачатковы перыяд вайны на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У кнізе ёсць унікальная табліца "Праект будаўніцтва ўмацаваных раёнаў Заходняй асобай вайсковай акругі на 1940-41 гады". Аўтар робіць выснову: "Планы па будаўніцтве ўмацаваных раёнаў былі больш чым амбіцыйнымі, але іх рэалізацыя ніяк не можа быць названа паспяховай. Да 22 чэрвеня 1941 года, гэта значыць усяго за паўгода да прызначанага ў планах тэрміну (і пасля больш чым года будаўнічых работ) у стан боегатоўнасці былі прыведзены крыху больш за 7,3% ад неабходнай колькасці збудаванняў". Прытым вучоны браў у разлік тры віды збудаванняў: агнявыя кропкі, назіральныя пункты, ілжывыя доты.

Што да германскіх умацаванняў на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якія зусім слаба вывучаны, то ім прысвечаны цэлы раздзел "Умацаванні 2-й Сусветнай вайны. III Рэйх". Па сутнасці, гэта першае ў гістарычнай навуцы асвятленне пытання. Безумоўна, даследчы працэс — на пачатковай стадыі, таму Вадзім Шорах пазначыў, куды рухацца. З аўтарам можна цалкам пагадзіцца, што пра нямецкія аб'екты дакладнай інфармацыі вельмі мала, сустракаецца ілжывая, таму "неабходныя вельмі маштабныя даследаванні як мінімум па ўсёй тэрыторыі Беларусі". Як бачым, аўтар мысліць сістэмна, смела выходзіць за межы гістарычнага апісання. Між тым усе, хто цікавіцца ўмацаваннямі, гісторыяй Бацькаўшчыны, знойдуць у кнізе канкрэтныя прывязкі да сучаснай мясцовасці. Так што ахвочыя могуць лёгка знайсці ды агледзець кожны згаданы ў кнізе аб'ект. Тым і каштоўнае выданне для турыстаў, а таксама даследчыкаў.

Вучоны б'е трывогу: сучасны стан большасці ўмацаванняў можна назваць аварыйным, яны паступова руйнуюцца. І хто, урэшце, у іх гаспадар? Хочацца, каб і такая спадчына з мінулага не знікла бясследна. Дарэчы, у кнізе — больш за паўсотні здымкаў. Таксама каштоўны матэрыял, і ўсе яны выдатнай якасці, як і 44 чарцяжы, кожны з якіх — вынік карпатлівай працы. Як вядома, толькі ў працэсе стварэння чарцяжа можна ў дэталях вывучыць збудаванне, падрабязна і дакладна яго апісаць. Увогуле Вадзім Шорах выкарыстаў больш за 60 крыніц інфармацыі, з іх 8 — публікацыі самога аўтара.

Так што — віншую калегу, які напісаў цікавую і патрэбную кнігу. Яна, безумоўна, знойдзе ўдзячных чытачоў і ў Беларусі, і ў замежжы.

**Міхаіл Стралец,**
доктар гістарычных навук,
прафесар, г. Брэст

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

# Ёсць выдатны прэс-кантакт!

**Беларускія выданні ў чарговы раз былі прадстаўлены на фестывалі "Прэса-2016" у Самары**

Сёлетні, XXIII фестываль "Прэса-2016" прысвячаўся 55-годдзю першага палёту чалавека ў космас. Сярод ганаровых гасцей свята былі кіраўнік Самары Алег Фурсаў, старшыня гарадской Думы Галіна Андрыянава, старшыня рэгіянальнай арганізацыі Саюза журналістаў Расіі Ірына Цвяткова і лётчык-касманаўт, Герой Расіі Міхаіл Карніенка — ён ураджэнец прыволжскага горада Сызрань.

"Тэма палёту ў космас блізкая і для беларусаў, — гаварыла гасцям стэнду Ірына Глуская, прэзідэнт суполкі "Руска-Беларускае Братэрства 2000". — Беларуская зямля ўзгадавала касманаўтаў, двойчы Герояў Савецкага Саюза Пятра Клімука і Уладзіміра Кавалёнка, з маладзейшых — Героя Расіі Алега Навіцкага. Памятае пра свае беларускія родавыя карані і першая ў свеце жанчына-касманаўт Валянціна Церашкова: у яе мама была родам з вёскі Ерамееўшчына цяперашняга Дубровенскага раёна, а тата — з-пад Магілёва. Называе беларусам сябе Герой Расіі Антон Шкаплераў, і ў Героя Расіі Алега Арцем'ева, як мы нядаўна даведаліся з "Голасу Радзімы", родавыя карані — з мястэчка Друя: у Браслаўскім раёне нарадзіўся яго бацька".

Публікацыі пра нашых супляменнікаў-касманаўтаў ёсць у штотыднёвіку "Голас Радзімы", нумары якога былі на беларускім стэндзе. Прэзентавалі беларусы Самарскай вобласці свой часопіс "Единство. Адзінства" (якраз выйшаў чарговы нумар), а таксама часопіс "Союзное государство". Увогуле для іх удзел у форуме журналістаў і сяброў СМІ, які штогод праходзіць у апошнюю суботу мая ў Струкаўскім садзе, — добрая традыцыя. І для жыхароў Самары і вобласці, якія маюць беларускія карані, наведаць Фестываль прэсы — таксама не ў навіну. Гэта ж адметнае свята, на якім можна пазнаёміцца, пагутарыць з суродзічамі, удыхнуць пах прэсы з Бацькаўшчыны.

Ірына Глуская расказала, што ўжо шмат гадоў на беларускім стэндзе пачэснае месца займае "Голас Радзімы", любімая ў суполцы газета: "Гэта здорава, што з выданнем у нас — выдатны прэс-кантакт. Пра галоўныя справы суполкі, падзеі мы імкнемся напісаць у рэдакцыю. І нас друкуюць, у тым ліку і на першай старонцы! Гэта — вялікі маральны стымул для далейшай працы. Разумеем: журналісты з Мінска за мяжу не часта выязджаюць — трэба ж і нам падтрымліваць газету! І як прыемна: усе, хто падыходзіў да нас, адзначаюць высокую якасць паліграфіі, сучасную падачу матэрыялаў. Спрабуюць чытаць! Вельмі радуюцца, калі атрымліваецца! Ёсць ахвочыя падпісацца на выданне. Мы ж раім заглядваць і на сайт. А некаторыя госці стэнда казалі: сёлета ўлетку адпачынак правядзем у Беларусі. То можа восенню з намі падзеляцца ўражаннямі, а мы — і ў газету напішам. Таксама ж тэма!"



Ірына Глуская з сябрамі на фестывалі

Сталее, набывае вядомасць і грамадска-папулярны і літаратурна-мастацкі часопіс "Единство. Адзінства": яго выдае суполка "Руска-Беларускае Братэрства 2000". Упершыню выданне прэзентавалася на фестывалі ў 2014-м, і вось — чарговы нумар. "Вельмі рада, што паспелі да фестывалю, — гартае часопіс Ірына Глуская. — Вялікая праца! Тэксты цікавыя, актуальныя. Пішам, напрыклад, аб супрацоўніцтве тэатраў Мінска і Самары, пра беларускія родавыя карані вялікага кампазітара, сёлетняга юбіляра Дзмітрыя Шастаковіча: ён, дарэчы, у гады Вялікай Айчыннай вайны жыў і працаваў у Самары. Расказваем пра "Славянскі базар у Віцебску". Працягваем друкаваць і "Урокі беларускай мовы".

**Мікалай Бойка,**
г. Самара

СВЯТА

# Сустракаемся ў Гродне

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

А вось папіць гарбаты з карэйцамі можна было, сеўшы на падлогу. Старшыня Асацыяцыі беларускіх карэйцаў Ры Кімі расказвала: карэйцы не карыстаюцца крэсламі ды ложкамі. У дамах былі цёплыя падлогі, таму людзі на іх і елі, і спалі. А замест пуховых падушак выкарыстоўвалі валікі, напоўненыя збожжам, што вельмі карысна для здароўя.

На вуліцах Гродна так шмат было ўсмешак! Здавалася: усе тут ведаюць адзін аднаго, а госці — прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў — сыны і дочкі адной вялікай і дружнай сям'і. Так, прыемна было назіраць, як музыку для танцораў з армянскага ансамбля "Эрэбуні" стваралі карэйскія барабаншчыкі, рускія падпявалі ўкраінцам, а ўкраінцы апладзіравалі рускім...

Пад час фестывалю і мяне чакалі некалькі сюрпрызаў. Ля беларускага падворка, ля парку імя Жылібера, сустрэліся з кіраўніком беларускага ансамбля "Цаглінкі" з польскай вёскі Старое Ляўкова, што пад Беластокам, Міколам Мяжынным. Запрашаў у сярэдзіне ліпеня ў госці: будуць адзначаць 40-годдзе калектыву. А на плошчы Леніна пабачыліся з кіраўніком Віленскага клуба "Гервечай" Альфонсасам Аугулісам. Ён узгадаў, як заходзіў неяк да нас у рэдакцыю і падзяліўся планамі: хоча наладзіць прэс-тур па Літве для журналістаў, якія пішуць на беларуска-літоўскую тэматыку. Абяцаў, што запросіць і карэспандэнтаў "Голасу Радзімы".

Папрыгажэў горад Гродна яшчэ больш за час фестывалю. У Парку дружбы народаў, ля Каложскай царквы, з'явіліся новыя дрэвы ад удзельнікаў, што ўпершыню пабывалі на свяце. А ля падножжа ўзгоркаў, дзе размясціліся Стары і Новы замкі, на правым беразе Нёмана адкрыта скульптура "Ладдзя-насада". Гродзенскі майстар Уладзімір Панцялееў выканаў яе, узяўшы за ўзор шахматную ладдзю XII стагоддзя і падарыў роднаму гораду. Яшчэ ў Гродне з'явіўся Музей Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур. Быў прэзентаваны Фотаальбом-летапіс свята, у які ўвайшлі фотаздымкі за ўсе 20 гадоў фэсту.



КАЦЯРЫНА МЯДЗВЕДСКАЯ

Фігурай дракона і вогненным шоу здзіўлялі гасцей прадстаўнікі кітайскай дыяспары



КАЦЯРЫНА МЯДЗВЕДСКАЯ

Прывітанне ад украінскіх сяброў



Венесуэльцы ўмеюць весяліцца

Вельмі насычаная была на гэты раз і музычная праграма. Удзельнікі ад нацыянальных аб'яднанняў, а таксама эстрадныя выканаўцы выйшлі на сцэну ў вячэрнім гала-канцэрце майстроў мастацтваў "Кветкі Радзімы". І выконвалі песні, папулярныя ў розных краінах. Так, Аляксей Грос спяваў па-эстонску, група Las Vegas — па-латышску, а "Чысты голас" — на іўрыце. На беларускай мове, але ў сучаснай апрацоўцы выканаў "Рэчаньку" гурт NAVI, а "Дразды" прадставілі "А я лягу-прылягу".

На заключным канцэрце Міністр культуры Барыс Святлоў прыгожымі словамі завяршыў XI Фестываль нацыянальных культур: "Беларусь — гэта ручнік, на якім могуць вышываць культурныя ўзоры прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў". Нездарма і сімвалам свята быў абраны сёлета бусел, крылы якога ўпрыгожваюць нацыянальныя арнаменты розных народаў. Вось і сімвалічныя фігуркі гэтай птушкі разам з дыпломамі ўдзельнікаў павезлі з сабою кіраўнікі дыяспар і творчыя этнакалектывы.

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

# Прыгажосць адчулі сэрцам

**Цюменьскія беларусы расказалі чытачам абласной бібліятэкі пра "Зямлю з блакітнымі вачамі"**

У той дзень у Цюменьскай абласной спецыяльнай бібліятэцы было шумна і шматлюдна, гучала руская і беларуская гаворка. Пры ўваходзе чытачоў сустракалі людзі ў нацыянальных беларускіх касцюмах. Гэта было сумеснае мерапрыемства бібліятэкі і аддзела беларускай культуры Дома нацыянальных культур "Строитель". Інтэрактыўная праграма "Зямля з блакітнымі вачамі" ладзілася да Дня славянскага пісьменства і культуры.

На выставе "Родная мова" — кнігі на беларускай мове і спецыяльныя выданні беларускіх аўтараў у рэльефна-кропкавым шрыфце і "размаўляльным" фармаце. Пра народныя традыцыі, звычаі беларусаў займальна расказала Людміла Татарынцава. Кожны ахвочы мог памацаць старадаўнія ільняныя ручнікі, нават папрасаваць іх драўляным "рублём". З цікавасцю даведваліся невідушчыя чытачы пра такія народныя промыслы, як пляценні з лазы і саломкі, выраб лялек-абярэгаў. Перфоманс "Дотык да вытокаў" даваў магчымасць тактыльна абследаваць нацыянальны касцюм, прымераць галаўныя ўборы. Такая задумка творчага калектыву ўсім спадабалася.



Людміла Татарынцава (справа) правяла майстар-клас

І канцэртная праграма з сімвалічнай назвай "Святло слова" давала слухачам новыя ўражанні. Выступаў моладзевы ансамбль "Верас" (кіраўніца — Клаўдзія Зуева, гарманіст Аляксандр Вахнічаў). Гучалі песні лірычныя і вясёлыя, сучасныя і народныя: "Радзіма мая", "Лявоніха", "Рускі сувенір", "Бульба" ды іншыя. Вершы на беларускай мове чыталі юныя Даша Акшэнцава і Дыяна Каржуева. Спецыяльна, каб наведаць майстар-клас Людмілы Татарынцавай, якая ўмее стылізаваць звычайную кнігу пад старадаўнюю, прыехала ў бібліятэку Алена Яснова. Цяпер яна таксама ведае сакрэты майстэрства.

Сустрэча з цюменьскімі беларусамі атрымалася цёплай, яркай, запамінальнай. Невідушчыя чытачы настолькі прасякнуліся беларускімі матывамі, што й самі выходзілі падпяваць на імправізаваную сцэну. Кацярына Бруй, напрыклад, выканала на беларускай мове народную партызанскую песню.

**Наталля Расамахіна,**
г. Цюмень

ПЛАНЕТА ЛЮДЗЕЙ

# Новыя фарбы сяброўства

**Лявон Целеш**

**"Слова, якое аб'ядноўвае народы" — так называўся круглы стол, прысвечаны беларуска-румынскім літаратурным сувязям**

Цікавая імпрэза праходзіла ў канферэнц-зале Мінскай дзіцячай бібліятэкі №10, яе ладзілі Выдавецкі дом "Звязда" і Мінскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі. Ганаровымі ўдзельнікамі размовы былі Пасол Румыніі ў Беларусі Віарэл Машану з жонкаю Надзяй. Спачатку дырэктарка бібліятэкі Людміла Лустова азнаёміла гасцей з бібліятэкай, затым на шырокім экране дэманстраваліся краявіды Румыніі, яе гарадоў. Пасол Румыніі цікава расказаў пра беларуска-румынскія літаратурныя сувязі, правёў паралелі ў развіцці беларускай і румынскай літаратур. Свой пункт погляду на тое, як далей развіваць супрацу, выказаў дырэктар-галоўны рэдактар Выдавецкага дома "Звязда", пісьменнік Аляксандр Карлюкевіч. Уражаннямі ад Румыніі падзяліўся пісьменнік і грамадскі дзеяч Анатоль Бутэвіч: у свой час ён працаваў Паслом Беларусі ў Румыніі. Пісьменнік пераклаў творы некаторых румынскіх аўтараў на беларускую мову, выдадзены па-румынску яго зборнік казак.

Жонка пасла, Надзя Машану, прачытала верш румынскага паэта Міхая Эмінэску. Свае вершы чыталі прадстаўнікі малдаўскай дыяспары ў Беларусі Васіль Семянюк і Дзмітрый Ліку. З вітальным словам да ўдзельнікаў круглага стала звярнулася вядучы бібліятэкар Святлана Бахнова. Вершы Якуба Коласа, а таксама свае вершы пра Беларусь, Мінск чыталі вучні 8 "А" класа 121-й школы. Вяла рэй на круглым стале пісьменніца, журналістка Алена Стэльмах. Пад час сустрэчы было падпісана Пагадненне аб супрацы ў галіне літаратуры паміж Пасольствам Румыніі ў Беларусі, Мінскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў, дзіцячай бібліятэкай №10 г. Мінска. Пасол Віарэл Машану падзякаваў Людмілу Лустову за гасціннасць, падарыў бібліятэцы маляўнічыя альбомы, прысвечаныя славутасцям Румыніі.



Выступае Васіль Семянюк

**Заснавальнік:** Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск
**Рэдактар** Віктар Міхайлавіч Харкоў
**Адрас рэдакцыі:** пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
**Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61.** Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
**Бюро па рэкламе:** Тэл. +375 17 290 60 11
**Тэлефон рэдакцыі:** +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31
**E—mail:** golas_radzimy@tut.by
**Аб'ём выдання:** 1 друк. арк.
**Тыраж:** 1935, **Заказ:** 864
**Час падпісання ў друк:** 20.10
Выходзіць 1 раз на тыдзень
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.
© "Голас Радзімы", 2016